*Аляксей Ненадавец*

# ПРАБЛЕМА ЗЛА Ў НАРОДНАЙ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

Праблема, якая разглядаецца ў артыкуле, не мае адзіна магчымага рашэння. І справа не ў тым, што не хапае матэрыялу для ўсебаковага аналізу, а ў тым, што і паводле якога крытэрыю вызначаць: хто ж такі злы чалавек, каго адносіць да гэтай катэгорыі? Калі браць азначэнне зла ў філасофскім плане, багаслоўскім, то атрымаецца, што ўвогуле тых, хто не стварае зла, няма. Любы з нас будзе належаць да яго носьбітаў. Тут ўсё прадугледжана, запраграмавана самой тэорыяй, вызначэннем, рэлігійнымі канонамі. І самае, здавалася б, дзіўнае, што тут нічога не пераменіш, бо гэта не так проста.

Нават спрабаваць рабіць такія намаганні мы не будзем, таму што ставілі перад сабой крыху іншую задачу: паказаць, прааналізаваць прычыны ўзнікнення, крыніцы зараджэння, захавання і існавання бытавога зла, таго, якое прысутнічае ў нашым жыцці, сярод нас пастаянна і, што самае галоўнае, як нам здаецца, ніколі і нікуды не знікае, а проста пераўтвараецца ў нейкую іншую адмоўную сілу, набывае знаёмыя ці незнаёмыя нам раней уласцівасці і асаблівасці. Гэтая сіла суправаджае нас у жыцці. Яе можна назваць па-рознаму: адмоўнай, чорнай, нежывой, разбуральнай, смяротнай і, канешне ж, злой. Кожны па-свойму адчувае яе ўплыў на сабе. Некаторыя сцвярджаюць, што не адчуваюць увогуле. Толькі здаецца, што яны проста не задумваліся над такімі праявамі зла. Яно для іх не існавала (так ім падавалася), бо зло неяк абмінала пэўны род, сям'ю, не ўмешвалася ў жыццё канкрэтнай сям'і. Вось і вынікала, што зло як існавала, так і працягвала існаваць, але нейкі індывід адчуваў на сабе яго адмоўную сілу. Яму шанцавала ці лёсам яму было наканавана потым адчуць на сабе праявы нейкага «адкладзенага» зла. І тады ўжо невядома будзе, як з ім абыдзецца той самы лёс, куды ён паверне і... што з гэтага атрымаецца. Можна падумаць, што гэта шчаслівы чалавек, але толькі падумаць, бо чалавек ніколі не павінен забывацца пра існаванне зла, пра яго абавязковую «суправаджальную» функцыю. Так яму будзе прасцей супрацьстаяць злу, трымаць удар наканаванасці лёсу, аднаўляць свае станоўчыя сілы (а гэта абавязковая ўмова, бо існаванне, працяглае па часе, аднаго толькі зла прыводзіць да перахілу ў адвечнай суаднесенасці архетыпічнай пары дабро – зло). Калі не будзе аднаўлення станоўчай сілы, захавання яе ранейшых пазіцый, імкнення да іх пашырэння, то, безумоўна, будзе пашырацца тэрыторыя зла, як на нейкім лакальным узроўні, так і на глабальным. Гэта непарыўны ланцуг.

Чалавек (чалавецтва) даўным-даўно прызнаў існаванне зла: страшэнную сілу яго ўздзеяння, зафіксаваў ўсё гэта не ў адзінкавым здарэнні. Паспеў, здавалася б, не адзін, не два разы прааналізаваць усё да драбніц, даць адпаведную ацэнку і тым не менш, прыйшоў да адназначнай высновы. Ці не знайшоў яе. Прызнаем і гэта, бо ўсё роўна нікуды мы не дзенемся ад фактаў

суровай рэальнасці праяў зла. Калі праблема разглядаецца старанна, усебакова, скрупулёзна, то ствараецца ўражанне, што паміж імі вельмі многа агульнага. А яно так і ёсць на самай справе, што ў глабальным, што ў бытавым плане. І, вядома ж, маштабы ўздзеяння зла таксама істотна адрозніваюцца. Продак выдатна разумеў і, самае галоўнае, безагаворачна верыў у існаванне зла, пастаянна і паўсюдна імкнуўся хоць неяк засцерагчыся ад яго ўздзеяння, калі не нейтралізаваць зусім, то хоць паспрабаваць зменшыць, абмежаваць яго адмоўную сілу. Тут яшчэ можна падкрэсліць, што яны змагаліся ў асноўным з бытавым злом. І гэта не толькі з-за таго, што не маглі б супрацьстаяць злу глабальнаму. Для продкаў гэтае зло было амаль што абстрактным, няўяўным. Яно заўсёды асацыіравалася з нейкім усеагульным горам-бядою, не меншым, чым лютая, крыважэрна-страшэнная вайна-бітва ці жахліва-вынішчальная пошасць-эпідэмія; успрымалася ўсеагульнай трагедыяй, якая закранала ўсіх ці пераважную большасць людзей краю.

Недзе там, у сівых стагоддзях, зарадзілася, умацоўвалася і доўгі час захоўвалася свяшчэннае радавое правіла: усім светам супрацьстаяць бядзе, няшчасцю, гору, злу. І гэта тады не рэгулявалася пэўнай дзяржаўнай палітыкай (канкрэтнымі загадамі, ідэалагічнымі заклікамі), а трымалася на трывалых устоях народнай, няхай сабе ў нечым вельмі наіўнай, свядомасці, калі была ўпэўненасць, што толькі выступаючы адзіным светам, можна супрацьстаяць пашырэнню зла. Але гэтыя рода-плямённыя намаганні паступова ўсё ж адыходзілі на задні план, саступаючы пазіцыі будзённым праблемам, якія ў сям'і селяніна- земляроба і былі пераважаючымі, асноўнымі. Менавіта з імі ён імкнуўся «разабрацца» ў першую чаргу, забяспечыць сабе і блізкім нейкую ўпэўненасць, трываласць. Чалавек зямлі нікуды ад роднай зямлі не аддаляўся, бо ў яго заўсёды атрымлівалася, што «тут нарадзіўся і тут прыгадзіўся». Жыў на гэтай зямлі, працаваў на ёй і знаходзіў апошні свой прытулак. Таму і не здзіўляе, што бытавое зло ў свядомасці людзей ужо тады, у далёкія часы, успрымалася як… асноўнае, бо яно «знаходзілася» побач, магло з'явіцца ў любы момант, які тым не менш, пачынаў кантралявацца, залежаць ужо ад самога чалавека, ад яго паводзін, учынкаў, пэўных акалічнасцей, што склаліся ў выніку сацыяльна-эканамічных адносін, нават кліматычных умоў. У гэтым плане нічога нельга пакідаць па-за ўвагай, бо тады атрымаецца «абавязковае» ўпушчэнне нейкага пэўнага факта-драбніцы, які для канкрэтнага моманту нараджэння зла (стварэння «злой сітуацыі») можа аказацца рашаючым. І атрымліваецца, што пры стварэнні цэласнасная карціны зла прапушчаным якраз-такі аказаўся самы важны эпізод. Тут ужо гаварыць пра поўную дакладнасць проста не выпадае.

Падыходзячы да ўсебаковай ацэнкі (калі нам толькі такое ўдасца), абавязкова адзначым, што бытавое зло стала для беларускага вяскоўца самай моцнай адмоўнай з'явай, на якую ён заўсёды звяртаў належную ўвагу.

Апошнія два гады, падчас летніх экспедыцый, калі я самастойна вандраваў па Палессі, дапытваўся ў кожнага са сваіх інфармантаў, якія паведамлялі мне многа цікавага па іншых пытаннях: «Чаму ўзнікае зло? Хто яго нам утварае? Ад чаго выходзіць гэтае зло-злыбяда?». Большасць людзей, вядома ж, асабліва не

задумваючыся, адразу прамаўляла: «А хто яго ведае, чаго яно ўзнікае». Іх адказы былі імгненнымі, а значыць, непадрыхтаванымі, непрадуманымі, бо даводзілася адразу ж фіксаваць і іншае: людзі перайначваліся на вачах! Пасля таго, як адказалі адмоўна, яны пачыналі разважаць, прыводзіць аргументы ў якасці нейкіх доказаў «за» ці «супраць» сваіх высноў, і тут ужо адназначны адказ быў немагчымым! Пагартаўшы дзённікі палявых запісаў з гэтымі выказваннямі, паспрабаваў неяк усё ж класіфікаваць іх, даць у пэўнай лагічнай паслядоўнасці. Вось што атрымалася: «*...У тым, што зло творыцца, няйначай, як мы самі і вінаваты. Мы ж яго з сябе і выпускалі на людзей. Ледзь што якое, то замест таго, каб усміхнуцца, каб паспрыяць чалавеку, дык адразу ж на яго ўскідваемся. Крык, гнеў, словы зняважы – не што іншае, як зло ў сваіх розных праявах. Не падумаеш, успыхнеш, а язык – чэша так, што ні на імгненне не спыняецца! За што? Галоўнае, што не задумваючыся ўсё творыцца. Злое само па сабе наплывае, але ж гэтае зло не проста сыходзіць, яно ж адрасуецца нейкаму канкрэтнаму чалавеку, скіравана на яго, уздзейнічае, уключаючы сваю злую энергію. Пра гэта ж нельга ні ў якім разе забывацца. Такое зло можна называць таксама імгненным нараджэннем непрадуманага гневу. Зло – гэта і ёсць зло, бо яно ж забівае, таму яно не павінна мець месца для існавання, ні ў якім разе. Галоўнае, каб кожны разумеў адмоўную сілу гэтакага зла і стараўся не даваць магчымасці яму нейкім (няхай сабе) чынам праявіцца. Той жа, хто такое ўчыняе, дык потым жа сам і адплочваць будзе. Зло, яно не знікае нікуды, а застаецца назаўсёды з тым, хто яго ўтварыў. Нікуды яго не схаваеш, нідзе яно не прападзе, стане да пэўнага моманту незаўважным, потым – зноў выскачыць на пэўны час, на канкрэтнага чалавека. Такое зло страшнае тым, што яно яшчэ зусім непрадуманае, а ў такой сітуацыі любы з нас «нажадае» такога! Не, зло ёсць зло, і яно заўсёды непажаданае*»; «*Зло выходзіць ад таго, што чалавек не кантралюе сябе ў пэўныя моманты жыцця. Бывае такое наваліцца, што гнеў, злыбяда ўсялякая проста розум слепіць і таму нават нельга гаварыць пра тое, што можна ўстрымацца. Калі зло «закіпае» ў душы, але потым нікуды не выходзіць, то, адпаведна, яно і нястрашнае, бо ні на каго не сыходзіць, не ўплывае. Ды такое рэдка вельмі здараецца. У асноўным жа, калі зло ўспыхвае, то яно на некага і пераходзіць. Такім чынам, зло працягвае сваё разбуральнае дзеянне, яно не спыняецца, а чыніць далейшае зло, наносячы неадчувальны (на першы погляд) урон таму, супраць каго накіравана. Хто яго ведае, ад чаго такое зло з'яўляецца. Здаецца, сам жа над усім разважаеш, пра ўсё думаеш, засцерагаешся, каб нічога такога благога на людзях ці на людзей нават не падумаць, а вось калі той момант надыдзе, то усё роўна, як і не існавала гэтых разважанняў, не было гэтых спроб самаўстрымання. Нешта проста імгненна адразу ж разбуралася, здавалася перад тымі праявамі зла. Што яго магло наклікаць? Самая дробязная акалічнасць. Недзе нешта не атрымалася, вось ужо і пачынаеш заклікаць, сыплеш налева-направа ліхімі словамі, спыніцца не можаш, а трэба было б, каб яно не павялічвалася, каб не распаўсюджвалася на людзей, каб не знаходзіла сабе чорнага прытулку ў іхніх душах, бо потым жа яны тое зло ад сябе ужо на іншых будуць насылаць. Ні ў якім разе нельга яго памнажаць, пераносіць, дапамагаць яму ўзмацняцца.*

*Нехта можа падумаць, што гэта ўсё няпраўда, але ж, як бачым, усё паўтараецца не адзін і не два разы. Зло не можа быць малым і вялікім, бо гэта ж зло...»*; *«...Зло ніадкуль ніколі не выходзіць, яно проста сядзіць у кожным чалавеку і чакае моманту, калі трэба выйсці. Ніхто спецыяльна не ўзмацняе той момант, бо ён узмацняецца нейкім невядомым ці ўвогуле нетлумачальным штуршком. У якасці такога штуршка мог разглядацца нейкі кароткачасовы гнеў, нанесены крыўдай, znявагай, фізічнай расправай. На гэта той, хто пацярпеў, адпаведна, адразу ж рэагаваў сваім злом, якое, аказваецца, ужо даўным-даўно было нагатове, «сядзела» ў самім чалавеку і знайшло выйсце пры першай жа неабходнасці. Такім рэагаваннем можна было растлумачыць яшчэ і тое, што чалавек, носьбіт зла, быў раззлаваны не на прамое на сябе ўздзеянне, а на нейкае другараднае яго праяўленне. Часта даводзілася чуць, як нехта гаварыў, што пасварыўся з дзецьмі, а заклікала, помсціла яму іхняя маці. Вось гэтае зло і нараджалася нават не ў таго, на каго ўздзейнічалі, а ў нейкага чалавека, які знаходзіўся па-за гэтымі межамі зла. Не раз было і такое, калі на зло, на нейкія яго праявы чалавек усё ж спрабаваў не адказваць, устрымліваўся, не паддаваўся правакацыйнаму дзеянню з боку зневажальніка. То на такога звычайна гаварылі, што ён быў моцным арэшкам, што ў яго жалезны характар, што ён малайчына, бо на зло не адказваў злом...».*

Як бачым, з гэтых сведчанняў так пакуль што і незразумела, дык адкуль жа і чаму з'яўляецца тое зло? Нам здаецца, што мы ведаем адказ. Проста нашы інфарманты не ведалі і не ведаюць адказу на гэтае пытанне. Для іх зло ў многім па-ранейшаму застаецца нейкай своеасаблівай табуіраванай зонай, куды яны часта баяцца глыбока пранікаць (уваходзіць, каб неяк разабрацца) ці нават не спрабуюць гэта зрабіць, бо не вельмі задумваюцца над тым, што зло здольна на самай справе ўзнікаць з-за нейкіх людскіх правіннасцей, учынкаў. Для іх тлумачэнне такой з'явы ўвогуле вельмі простае, бо яны адмаўляюцца яе тлумачыць: *«Ат, якое там гэта зло. Проста ўсё так, само па сабе, склалася, усё падстроілася. Падстроілася. Хто б мог падумаць, што той старой бабе і слова нельга сказаць, бо яна ў адказ чараваць пачне і не проста так, а са злом. Ніхто ж ёй не збіраўся нейкай там нягоды рабіць, яна сама ўсё так іменна ўспрымала. Якое там зло ў галаве сядзіць, няпраўда гэта. Кожны, як уздумае што, усё па-свойму тлумачыць. Тады атрымліваецца, што нават добры чалавек можа абавязкова нешта злое ўчыніць, а гэта ж няпраўда. Добры чалавек і робіць па-добраму, да дабра імкнецца, а мы ж яго заранёй у нечым злым абвінавачваць станем. І тое, што зло нараджаецца, таксама не веру. У такім разе, адкуль жа яно бярэцца? Хто яго ведае. Зло ёсць зло, вось і ўсё на тым. Але ж неяк дзіўна атрымліваецца. Як ні круці, выходзіць, то яно ўсё роўна ёсць і будзе. Калі не па-мойму, дык па-вашаму, і наадварот. Дзіўная гэта справа. Ніхто, мабыць, не стане аспрэчваць, але ж ніхто не стане і пацвярджаць. Каб усё зналі, то наперад бы ўсялякай дурніцы не чынілі б»*; *«Гэта ж не зло ў нас сядзіць. Не, а гэта тое, што называецца гневам. Самі ж бачыце, раззлуецца чалавек, то тады ад яго і злом патыхае. Па-іншаму проста і не скажаш. Вось ходзіць, ходзіць чалавек, а потым яго нібыта нехта раптоўна падменіць: адразу ж накінецца на каго і давай няславіць, давай*

*бэсціць, каб прынізіць, зрабіць злое, адмоўнае, не даць таму, на каго ўздзейнічае, адыйсці, падрыхтавацца да адпору. Зло ў чалавеку не сядзіць, я так думаю, а яно прыходзіць і сыходзіць. А яшчэ многае, мабыць, залежыць ад таго, хто ўсё гэта разварушыў і задумаў утварыць. На некаторых жа ў нас людзі так і гавораць, што яго лепей не зліць, не даводзіць, бо тады давядзецца з ім разбірацца. Старэйшыя то так і рабілі – ці не чапалі, ці не злілі, ці абыходзілі, «не будзі ліха абы было ціха». Маладзейшыя ж наадварот, калі бачаць ці ведаюць, што нехта са старэйшых на ўсё гэта «прыпадае», дык яшчэ болей стараліся яго раззлаваць, давесці, каб потым пажартаваць, пасмяяцца. З іх, хутчэй за ўсё, ніхто нават і не задумваўся, чым гэта можа абярнуцца для іх саміх ды для іхніх сем'яў... А калі па праўдзе, то не ведаю, што вам і сказаць, адкуль яно тое зло бярэцца. Сядзіць яно ўжо ў нас, як вы гаворыце, ці прыходзіць у нейкі ўзрушальны момант, як я вам даводжу. Невядома мне, але, калі задумаўся, то сапраўды стала карцець даведацца пра ўсё падрабязна»; «На самай справе, дык і задумвацца не даводзілася, адкуль яно тое зло бярэцца. Колькі разоў бачыў, як іншыя злаваліся, сам са злосці ажно заходзіўся, бо я чалавек ад прыроды і нястрыманы, бачыце, прызнаюся, не хаваюся. А вось адкуль бярэцца? Не, думаю, што ўсё ж яно аднекуль находзіць, нечым насылаецца. Не можа ж яно ўвесь час у чалавеку сядзець, чакаць свайго часу. Не, аднекуль сыходзіць. Ніколі над такім не задумваўся... Чаму злуешся? Кажаце, што ад характару, ад натуры залежыць. А можа, яно па спадчыннасці перадаецца? Не ведаеце? Тут справа ў тым, што мае родныя, у ранейшых пакаленнях, калі браць з вашага пытання, дык таксама даволі ліхімі былі. Колькі памятаю пра прадзеда, пра дзеда распавядалі, то так і гаманілі, што за лепшае міналі, каб толькі не зачэпіць ды на зло іхняе нейкім чынам не нарвацца, бо ў зле яны былі надзвычай страшныя і непрадказальныя, маглі такое ўтварыць, што даруй Божа. Пра іх то адно расказвалі, а пра бацьку свайго, то я ўжо сам магу нараспавядаць розных гісторый. І сапраўды, амаль усё гэта ён у злосці ўтвараў. І білі яго за тую злосць, і дакаралі, і ў царкву клікалі, каб там сараміць перад усімі, але нічога не дапамагала. Прызнаваў сваю правіну, прасіў прабачэння, а потым зноў кідаўся на тых жа людзей. Калі на іх не атрымлівалася, дык на жывёле зло адводзіў, а то проста хапаў які кол і пачынаў ні з таго, ні з сяго лупцаваць, што было сілы, па плоце ці па якой будыніне. Тыя, хто ягонае дзівацтва ведалі і не баяліся, дык яшчэ падзуджвалі: «Дай яму, Міканорка, дай!» І ён ужо стараўся за ўсіх. Бачыце, то можа, мне па спадчыннасці тое зло і перадалося, можа, яно ад іх у мяне ўсялілася і сядзіць. Ніколі, паўтараюся, асабліва не задумваўся, але цяпер буду, бо і самому стала цікава, адкуль яно, тое зло, бярэцца».*

Не трэба здзіўляцца, што нашы інфарманты разважаюць менавіта ў такім кірунку. Большасць з іх сапраўды ніколі нават не даходзіла да таго, каб задумацца, як жа ўсё гэта ўзнікала, утваралася ці чаму так адбывалася. Другая палова – меншасць – магчыма, задумвалася, але, не знайшоўшы самастойна адказу, да іншых звяртацца за нейкімі падказкамі не палічылі за лепшае. Таму так і атрымалася, таму паўстала такая карціна. Мы ўжо адчулі, што калі толькі задумваліся, а не адказвалі «абы-як», «спяшаючыся нешта прамовіць», «абы

адказацца», то людзі ліхаманкава шукалі выйсце, спрабавалі даць нейкі больш-менш рэальны адказ, які сыходзіў ужо ад іхніх разважанняў. Глыбока лагічнымі іх таксама не назавеш. Разважанні пераходзяць з аднаго на другое, але добра ўжо  нават тое, што пачынаюць разважаць у гэтым плане, што будзе гарантыя адносна нейкага меншага працэнта сярод «злых» людзей. Не выключана ж яшчэ і тое, што з'явяцца ўсялякія агаворкі. Толькі пачнем  мы з традыцыйных, самая асноўная сярод іх, вядома ж, тая, якая звязана з нячыстай сілай, яе праявамі, уплывамі і г. д.